УДК 008(476)(092)

*Т.С. Пустаход*

# СТАРОНКІ ТВОРЧАЙ БІЯГРАФІІ МІХАІЛА БАБРОЎСКАГА. ПАЧАТАК БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

Артыкул прысвечаны творчай спадчыне і жыццёваму шляху вядомага святара, багаслова, славіста, арыенталіста, гісторыка, палеографа, бібліяфіла, заснавальніка скарыназнаўства і беларусазнаўства канца XVIII – першай паловы XIX ст. Міхаіла Баброўскага (1785–1848), біяграфія якога не прыцягвала пакуль сур’ёзнай увагі даследчыкаў. Паказана значэнне яго дзейнасці па выяўленні, вывучэнні і збіранні помнікаў стараславянскай пісьменнасці. Пералічаны асноўныя фактары, якія аказалі ўплыў на фарміраванне гістарычнага светапогляду вучонага. Выяўлены ўклад Міхаіла Баброўскага ў станаўленне беларускага нацыянальнага адраджэння, у прабуджэнне цікавасці да гісторыі і культуры беларускага народа.

## Уводзіны

Гісторыя Беларусі багатая на слаўныя імёны людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё служэнню Бацькаўшчыне. Адно з такіх імёнаў – Міхаіл Баброўскі – святар, багаслоў, славіст, арыенталіст, гісторык, палеограф, бібліяфіл, заснавальнік скарыназнаўства і беларусазнаўства. Галоўнае тое, што Міхаіл Баброўскі стаяў ля вытокаў беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XIX ст., прысвяціў сябе захаванню і зберажэнню старажытнай культуры беларусаў і ўсяго славянства.

Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена адсутнасцю ў гістарычнай навуцы абагульняльнага даследавання, прысвечанага жыццю і дзейнасці Міхаіла Баброўскага. Мэта даследавання – сістэмна разгледзець творчую спадчыну і жыццёвы шлях Міхаіла Баброўскага; выявіць яго ўклад у развіццё і станаўленне беларускага нацыянальнага адраджэння. Для рэалізацыі дадзенай мэты былі пастаўлены наступныя задачы: узнавіць асноўныя этапы жыцця і творчага шляху вучонага, выявіць асноўныя фактары, якія аказалі ўплыў на станаўленне яго гістарычнага светапогляду.

## Асноўныя вехі біяграфіі

Нарадзіўся Міхаіл Кірылавіч Баброўскі 19 лістапада 1785 г. у вёсцы Вулька Бельскага павета Гродзенскай губерніі (цяпер тэрыторыя Польшчы) у сям’і ўніяцкага святара. Баброўскія паходзілі са старажытнага шляхецкага роду, прадстаўнікі якога валодалі маёнткамі паміж Драгічынам, Мельнікам і Бельскам. Аднак сям’я святара Кірыла жыла ў беднасці, што было характэрным для ўкладу жыцця ўніяцкага святарства. К пачатку XIX стагоддзя ўніяцкая царква прадстаўляла сабой дзве плыні: магутны, моцна акаталічаны базыльянскі ордэн, члены якога займалі вышэйшыя пасады, і белае (жанатае) духавенства, якое было ў асноўным малазабяспечаным і неадукаваным [1, с. 50]. Тым не менш Кірыл Баброўскі даў магчымасць свайму сыну атрымаць добрую адукацыю. Міхаіл Баброўскі атрымаў першапачатковыя веды ў царкоўнаславянскай мове пад кіраўніцтвам свайго бацькі і ў Клешчальскай школе царкоўнаслужачых [2, с. 31]. Для далейшай адукацыі тады трэба было паступаць у школы, якія належалі манаскім ордэнам піяраў, езуітаў ці базыльян. Міхаіл у 1797–1803 гг. вучыўся ў Драгічынскім вучылішчы піяраў, дзе атрымаў веды па фізіка-матэматычных, гістарычных і маральных дысцыплінах, вывучаў французскую, нямецкую, грэчаскую і лацінскую мовы [3, с. 376]. Рашэнне на карысць піяраў было прынята таму, што ў іх школах ужываліся навейшыя педагагічныя метады, выкладаліся ўсе неабходныя для пачатковай адукацыі прадметы, панавала рэлігійная цярпімасць. Затым у 1804–1806 гг. Міхаіл Баброўскі вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, дзе за поспехі быў узнагароджаны срэбраным медалём. Трэба адзначыць, што яму прапанавалі застацца ў гімназіі настаўнікам.

Міхаіл Бабpоўскі ў 1806–1808 гг. працаваў у Беластоцкай гімназіі, адначасова ў Супрасльскім манастыры займаўся вывучэннем царкоўнаславянскіх старажытных рукапісаў і першадрукаў. Юнацкае захапленне і цікавасць да старажытных рукапісаў заклалі аснову яго далейшай навуковай дзейнасці. У 1808–1812 гг. Міхаіл Бабpоўскі працягваў сваю адукацыю ў Галоўнай семінарыі пры Віленскім універсітэце. Галоўная семінарыя, адкрытая ў 1803 г., з'яўлялася вышэйшай навучальнай установай, у якой разам з каталікамі вучыліся і ўніяты. Выпускнікі семінарыі маглі займаць вышэйшыя адміністратыўныя пасады ў кіраванні каталіцкай і ўніяцкай цэркваў, а таксама маглі быць выкладчыкамі ў епархіяльных семінарыях [4, с. 3]. Міхаіл Бабpоўскі вырашыў прысвяціць сябе навуцы. За чатыры гады навучання ў Галоўнай семінарыі ён быў удастоены ступені магістра філасофіі ад маральна-палітычнага факультэта (5 мая 1811 г.), ступені магістра славеснасці ад славеснага факультэта (24 чэрвеня 1811 г.); пасля заканчэння курса ў Галоўнай семінарыі ён быў удастоены ступені магістра багаслоўя (14 чэрвеня 1812 г.) [3, с. 376]. У 1812–1814 гг. Міхаіл Бабpоўскі наведваў курсы правазнаўства пры Віленскім універсітэце і ў 1814 г. стаў магістрам грамадзянскага і крымінальнага права [2, с. 32]. У 1814 г. Савет універсітэта запрасіў яго заняць кафедру Свяшчэннага Пісання ў якасці прафесара. У 1815 г. Міхаіл Бабpоўскі прыняў сан уніяцкага святара, у 1816 г. быў прызначаны членам Віленскай уніяцкай кансісторыі, а ў 1817 г. стаў брэсцкім канонікам [5, с. 19].

Здольнасці маладога вучонага звярнулі на сябе ўвагу Савета Віленскага ўніверсітэта. Менавіта Міхаіл Бабpоўскі быў адпраўлены ў навуковую камандзіроўку за мяжу. На працягу пяці год (1817–1822 гг.) ён жыў у Аўстра-Венгрыі, Чэхіі, Італіі, Францыі, Славеніі, Далмацыі, дзе вывучаў біблейскую археалогію і багаслоўе, герменеўтыку, славянскія і ўсходнія мовы, даследаваў у архівах і бібліятэках унікальныя калекцыі славянскіх рукапісаў і старадрукаў. У гэты перыяд Міхаіл Бабpоўскі сабраў багаты навуковы матэрыял і набыў шмат кніг. Тады ж ім быў складзены каталог славянскіх рукапісаў і старадрукаў Ватыканскай бібліятэкі, апублікаваны ў 1831 г., уведзены ў навуковы ўжытак шэраг літаратурных помнікаў [1, с. 51].

Падчас замежнай камандзіроўкі Міхаіл Бабpоўскі зрабіў навуковае апісанне старажытных кірылічных і глагалічных літаратурных помнікаў Ватыканскай бібліятэкі, якое было надрукавана яе галоўным хавальнікам А. Маі ў 1831 г. [6, с. 33]. М. Бабpоўскі ўвёў у навуковы ўжытак шэраг найважнейшых помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку першую глагалічную друкаваную кнігу «Місал па законе Рымскага двара» (Служэбнік, 1483 г.), што захоўвалася ў Ватыканскай бібліятэцы [7, с. 87]. Міхаіл Бабpоўскі пазнаёміў аматараў славянскай літаратуры з важным старажытным помнікам – выяўленай ім у Ватыканскай бібліятэцы «Хронікай Далмацкай» XI або XII ст. [8]. Вопыт знаёмства са славянскімі рукапісамі і друкаванымі кнігамі дазволіў вучонаму беспамылкова вызначаць час і месца стварэння літаратурных помнікаў.

Пасля вяртання з навуковай камандзіроўкі Міхаіл Бабpоўскі працягваў выкладчыцкую дзейнасць. У 1822–1833 гг. (з перапынкам у 1824–1826 гг.) ён займаў пасаду прафесара экзегетыкі і герменеўтыкі багаслоўскага факультэта Віленскага ўніверсітэта, выкладаў арабскую мову. У 1823 г. Міхаілу Бабpоўскаму прысвоена ступень доктара багаслоўя. Трэба адзначыць, што ў сваіх пропаведзях Міхаіл Бабpоўскі выступаў супраць базыльянскіх манахаў, вінаваціў іх у скажэнні абрадаў грэка-славянскай царквы. Па гэтай прычыне вучоны меў шмат ворагаў сярод лацінскіх і базыльянскіх манахаў. Яшчэ да вяртання Міхаіла Бабpоўскага ў Вільню Віленскі ўніверсітэт быў западозраны ў заступніцтве развіцця тайных таварыстваў сярод студэнтаў. Вучоны не мог быць абвінавачаны ва ўдзеле ў гэтых таварыствах. Тым не менш дзейнасць Міхаіла Бабpоўскага была прадстаўлена ў такім святле, што яго абвінавацілі ў дачыненні да студэнцкіх палітычных выступленняў і дзейнасці ва ўніверсітэце тайных студэнцкіх таварыстваў філа-

рэтаў, філаматаў і прамяністых, у якія ўваходзілі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка і інш. Вучоны ў 1824 г. быў адхілены ад выкладчыцкай дзейнасці і звольнены. Міхаілу Баброўскаму было забаронена жыць у Вільні, яго прымусова выселілі пад нагляд духоўнага начальства [9, с. 217]. Два гады (1824–1826 гг.) вучоны знаходзіўся ў Жыровіцкім базыльянскім манастыры. Дапамогу ў вяртанні ва ўніверсітэт Міхаілу Баброўскаму аказаў знакаміты дзяржаўны дзеяч, канцлер, граф Мікалай Румянцаў, які сустракаўся з вучоным у розных гарадах Еўропы, сябраваў з ім, знаходзіўся ў пастаяннай перапісцы.

У 1826 г. Міхаіл Баброўскі вярнуўся ў Вільню. Ён выкладаў біблейскую археалогію ў Віленскім універсітэце і царкоўнаславянскую мову ў Галоўнай семінарыі, займаў шэраг адміністратыўных пасад. Аднак пасля паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве, закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта і пераўтварэння ў 1833 г. Галоўнай семінарыі ў Рымска-каталіцкую духоўную акадэмію М. Баброўскі выйшаў у адстаўку, пераехаў у мястэчка Шарашова Пружанскага павета, дзе выконваў абавязкі прыходскага святара. У 1839 г. перайшоў у праваслаўе, а ў 1841 г. быў узведзены ў сан Пружанскага благачыннага [10, с. 411]. Памёр М. Баброўскі 3 кастрычніка 1848 г. на 64-м годзе жыцця ад халеры. Пахаваны на могілках каля мясцовай Свята-Петрапаўлаўскай царквы.

**Творчая спадчына Міхаіла Баброўскага**

Пры жыцці Міхаіл Баброўскі сабраў вялікую бібліятэку, якая стала першым спецыяльным зборам помнікаў беларускай старадрукаванай літаратуры. Асобныя кнігі з яго калекцыі захоўваюцца ў сховішчах Вільнюса, Масквы і Санкт-Пецярбурга. Пры жыцці М. Баброўскаму ўдалося надрукаваць толькі некалькі сваіх прац. Частка рукапіснай спадчыны знікла адразу пасля яго смерці, другая трапіла да бібліяфіла Ф. Транбіцкага, а потым разышлася па розных сховішчах. Большая частка гэтых рукапісаў загінула падчас Другой сусветнай вайны. Уцалелыя асобныя лісты, нататкі, матэрыялы, прызначаныя іншым асобам, зберагаюцца ў зборах Вільні, Кракава, Варшавы, Масквы, Санкт-Пецярбурга. Мабыць, па гэтай прычыне значэнне дзейнасці прафесара да сённяшняга часу не раскрыта ў поўнай меры, нягледзячы на тое, што ён быў вучоным еўрапейскага ўзроўню (М. Баброўскі з'яўляўся членам прэстыжнай Археалагічнай акадэміі ў Рыме, Парыжскага і Лонданскага азіяцкіх таварыстваў, Камітэта па выпрацоўцы харвацкага правапісу ў Далмацыі, Маскоўскага таварыства гісторыі і старарускай пісьменнасці) [11, с. 51].

Трэба адзначыць, што Міхаіл Баброўскі спрыяў узнікненню асобнага кірунку ў гуманітарных навуках – беларусазнаўства, абуджэнню сярод еўрапейскіх навукоўцаў цікавасці да гістарычнага лёсу яго роднага краю. Выкладаючы стараславянскую мову ў Віленскім універсітэце, Міхаіл Баброўскі збіраў старажытнабеларускія крыніцы, вывучаў беларускія гаворкі і народную творчасць. Аднак працы вучонага, якія датычацца беларусазнаўства, загінулі. Так, напрыклад, Міхаілам Баброўскім была падрыхтавана праца «Гісторыя славянскіх друкарняў у Літве», якая засталася неапублікаванай і лічыцца беззваротна страчанай. Вядома і тое, што вучоны напісаў працу «O charakterystycznych językowych zwrotach ludu białoruskiego», але лёс яе невядомы [6, s. 41].

Вядомасць у навуковым свеце М.К. Баброўскаму таксама прынесла адкрыццё Супрасльскага рукапісу. Супрасльскі рукапіс – гэта назва розных рукапісных зборнікаў, якія да XIX ст. зберагаліся ў бібліятэцы Супрасльскага Благавешчанскага манастыра. Найбольш вядомыя і каштоўныя зборнікі:

1. Зборнік жыцій і пропаведзяў XI ст. Напісаны царкоўнаславянскай мовай на пергаменце (285 лістоў), уяўляе сабой чэцця-мінею на сакавік, змяшчае 24 жыціі і 24 словы-павучанні, у тым ліку 20 слоў Іаана Златавуста. Разам з Тураўскім Евангеллем і іншымі рукапісамі XI ст. гэты зборнік – адзін з самых старажытных помнікаў усходнеславянскай пісьменнасці. У XIX ст. падзелены на 3 часткі, якія зберагаюцца ў Варшаве

(151 л.), Любляне (118 л.) і Санкт-Пецярбургу (16 л.) [12, с. 1]. У замежнай навуковай літаратуры гэты зборнік называюць Супрасльскім кодэксам (Codex Suprasliensis).

2. Летапісны зборнік першай пал. XVI ст. Складаецца з рускага скарочанага летапісу, кароткай летапіснай выбаркі па гісторыі Русі і ВКЛ пачынаючы з 862 г. і гістарычных запісаў пра падзеі канца XV – пач. XVI ст. на Беларусі, у Кіеве і на Валыні [13, с. 466].

3. Зборнік 1519 г. Змяшчае пераклад на беларускую мову Вісліцкага статута польскага караля Казіміра III Вялікага, «Кіева-Пячэрскі пацярык», самы поўны спіс другой рэдакцыі Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г., які складаецца з дзвюх частак: 1) «Избрание летописания», куды ўваходзяць скарочаны старажытнарускі летапіс (ахоплівае гісторыю Русі за 854–1427 гг.), Смаленская хроніка, «Пахвала Вітаўту» і смаленскія пагадовыя запісы за 1432–1446 гг. і 2) «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» з «Аповесцю пра Падолле» [14, с. 466].

Трэба адзначыць, што Супрасльскі кодэкс XI ст. у 2007 г. быў уключаны ў спіс «Помнікі свету» міжнароднага праекта ЮНЕСКА (Memory of the World International Register). Гэта падзея яшчэ раз даказвае вялікае значэнне дзейнасці М.К. Баброўскага як адкрывальніка аднаго з самых старажытных у свеце кірылічных помнікаў царкоўнаславянскага пісьменства.

У Супрасльскім кнігазборы Міхаіл Баброўскі пазнаёміўся з кнігамі Францыска Скарыны, звесткі пра якога ён збіраў на працягу ўсяго свайго жыцця і ўключыў у «Гісторыю славянскіх друкарняў у Літве», што так і не была надрукавана. Вучоны адкрыў для беларускай і еўрапейскай навукі імя знакамітага першадрукара, тым самым стаў першым беларускім скарыназнаўцам. Даследуючы гісторыю славянскага кнігадрукавання, Міхаіл Баброўскі сабраў навуковы матэрыял аб дзейнасці друкароў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, якія збеглі ў 1564 г. з Масквы. Вучоны прасачыў увесь іх далейшы лёс і апісаў усе іх выданні, як сумесныя падчас дадзенага ім Хадкевічам прытулку ў мястэчку Заблудава, так і асобныя ў Вільні, Львове і Астрозе [5, с. 54].

**Міхаіл Баброўскі – пачынальнік беларускага нацыянальнага адраджэння**

Навуковая спадчына Міхаіла Баброўскага садзейнічала развіццю беларускай свядомасці, тоеснасці і беларускага нацыянальнага адраджэнскага руху. Якія ж фактары паўплывалі на фарміраванне гістарычнага светапогляду Міхаіла Баброўскага, як ён змог апярэдзіць час у вырашэнні нацыянальнага беларускага пытання?

Яшчэ на пачатку XIX ст. знайшліся людзі, якія здолелі вызначыць Беларусь не як частку Расійскай імперыі, а як самастойную краіну. Сярод іх быў і Міхаіл Баброўскі. Ён разам з іншымі прафесарамі Віленскага ўніверсітэта марыў пра аднаўленне незалежнага ад Польшчы Вялікага Княства Літоўскага, вяртанне дзяржаўнага статусу беларускай мове. Магчыма, на погляды М. Баброўскага паўплывала тое, што ён нарадзіўся і вырас у сям'і ўніяцкага святара на Беласточчыне – тэрыторыі беларуска-польскага памежжа. Вядома, што ў насельніцтва памежных рэгіёнаў самасвядомасць выяўлена больш выразна, чым у цэнтры этнічнага масіву [15, с. 174].

Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай Беластоцкая акруга адышла да Прусіі (1795–1807 гг.). Па меркаваннях беларускага гісторыка Паўла Баброўскага, пляменніка Міхаіла Баброўскага, Беласточчына на гэты час стала цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Прусы ператварылі Беласток у буйны адміністратыўны цэнтр, які набыў выразна нямецкае аблічча. У акрузе пражывалі дзясяткі тысяч уніятаў, якія мелі 70 цэркваў і 3 манастыры – у Супраслі, Драгічыне і Кузніцы. Працавалі дзве важныя ўніяцкія школы – у Малой Бераставіцы і ў Клешчэлях. Прускія ўлады з дазволу Папы Рымскага стварылі ў 1796 г. самастойную супрасльскую ўніяцкую епархію са сваім капітулам і духоўнай семінарыяй [16, с. 10]. Нешматлікае духавенства супрасльскай епархіі вызначалася выключнай згуртаванасцю, рашучасцю ў змаганні за свае правы і самастой-

ными поглядамі на унію. Трэба адзначыць, што дванаццацігадовае прускае панаванне развіло ў падляшскіх духоўнікаў палітычную актыўнасць і нацыянальную свядомасць. Пры большых прыходах узнікалі царкоўныя брацтвы, якія змагаліся за адраджэнне «русскай» (г.зн. беларускай) культуры.

Яшчэ адзін фактар уплыву на светапогляд М. Баброўскага – магчымасць вырашэння палітычнага пытання. Вядома, што напярэдадні вайны 1812 г. распрацоўваліся праекты аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага, што таксама садзейнічала абуджэнню нацыянальных пачуццяў вучонага.

Немалаважнае значэнне мела і навуковае еўрапейскае падарожжа М. Баброўскага, падчас якога ён вывучаў мовазнаўства, біблеістыку, царкоўную арганізацыю. Знаёмства з маладымі заходне- і паўднёваславянскімі нацыянальнымі рухамі таксама трэба залічыць да спрыяльных фактараў у выспяванні беларускага нацыянальнага адраджэння.

На карысць характарыстыкі М. Баброўскага як пачынальніка беларускага нацыянальнага адраджэння сведчыць факт, адзначаны Паўлам Баброўскім ў манаграфіі «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I»: «Пасля Венскага кангрэса ў Заходніх губернях утварылася яшчэ адна, малавядомая партыя, якая мела на чале некаторых прафесараў Віленскага ўніверсітэта, якія ахвотней жадалі б аднаўлення былога Вялікага Княства, чым яднання Літвы і Валыні з мінулай Каронай; гэта нязначная па колькасці сяброў руска-літоўская партыя марыла аб адраджэнні беларускай мовы, на якой быў першапачаткова выдадзены Літоўскі статут, што яшчэ захоўваў сваю моц» [17, с. 204–205]. Слова «партыя» ў П. Баброўскага не мае сучаснага палітычнага сэнсу і азначае толькі групу аднадумцаў. Пад «некаторымі прафесарамі» разумеюцца Міхаіл Баброўскі і Ігнат Даніловіч.

Аб гэтых жа прафесарах, але ўжо адкрытым тэкстам піша аўтар трохтомнай працы аб гісторыі Віленскага ўніверсітэта Й. Бяліньскі: «На чале гэтай моладзі сталі Міхаіл Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Антон Марціноўскі» [15, с. 173]. Гэта пацвярджае і Яўхім Карскі ў трэцім томе сваёй фундаментальнай працы «Беларусы», дзе адзначае той факт, што ўніверсітэцкая моладзь, на чале якой стаяў Міхаіл Баброўскі, збірала беларускія матэрыялы паводле складзенай ім праграмы [11, с. 52].

**Заключэнне**

М. Баброўскі – асоба шматпланавая: вучоны і царкоўны дзеяч, славіст і гісторык, ён маштабамі сваёй дзейнасці выйшаў далёка за межы Беларусі. Ён быў прыхільнікам адраджэння самабытнай беларускай культуры, выкарыстання беларускай мовы ў афіцыйным ужытку. Міхаіл Баброўскі добра валодаў ведамі па гісторыі і мове беларускага народа, яго культуры, што не магло не паўплываць староўча на будучую грамадскую, палітычную і навуковую дзейнасць яго паслядоўнікаў. М. Баброўскі ўсё сваё жыццё прысвяціў выяўленню, вывучэнню і збіранню помнікаў стараславянскай пісьменнасці. Менавіта з яго іменем звязаны знаходка Супрасльскага рукапісу, вяртанне беларускай і еўрапейскай навуцы імя Францыска Скарыны, апісанне глагалічных і кірылічных кніг. Нягледзячы на страчаную спадчыну, Міхаіл Баброўскі ўнёс вялікі ўклад у прабуджэнне цікавасці да гісторыі і культуры беларускага народа, яго навуковая дзейнасць спрыяла развіццю беларускай свядомасці.Фактарамі, якія паўплывалі на станаўленне гістарычнага светапогляду М. Баброўскага, былі наступныя: жыццё на Беласточчыне – тэрыторыі беларуска-польскага памежжа; распрацоўка праектаў аднаўлення ВКЛ напярэданні вайны 1812 г.; навуковае падарожжа па краінах Еўропы. Працы і дзейнасць вучонага сталі ля вытокаў славяназнаўства і беларусазнаўства, прабуджэння цікавасці да гісторыі і культуры беларускага народа. М. Баброўскі стаў пачынальнікам беларускага нацыянальнага адраджэння і стварыў фундаментальную беларускую навуковую базу, на якой у далейшым грунтаваўся беларускі нацыянальны рух.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Носко, М. У истоков воссоединения с православием. Протоирей Михаил Бобровский / М. Носко // Брест. епархиальные ведомости. – 2010. – № 4. – С. 50–53.

2. Бобровский, П.О. Бобровский Михаил / П.О. Бобровский // Оттиск из «Критико-биографического словаря русских писателей и учёных С.А. Венгерова». – 1895. – 23 с.

3. Жукович, П. О профессорах богословского факультета Виленского университета в настоящем столетии / П. Жукович // Христианское чтение. – 1888. – Ч. 1. – С. 367–409.

4. Романчук, А.А. Главная семинария при Виленском университете: воспитание и образование католического духовенства униатского обряда / А.А. Романчук // Весн. ГрГУ. – 2006. – № 4. – С. 3–9.

5. Янковский, П. Протоирей Михаил Бобровский / П. Янковский // Литовские епархиальные ведомости. – 1864. – № 1. – С. 11–20; № 2. – С. 51–66.

6. Stankiewic, A. Mahnuseuski. Pauluk Bachrym. Babrouski. Da wytokau bialoruskaha adradzenia / A. Stankiewic. – Wilnia : Bielpres, 1937. – 45 s.

7. Лабынцев, Ю.А. Первая книга, напечатанная глаголицей, и её исследователь Михаил Бобровский / Ю.А. Лабынцев // Совет. славяноведение. – 1983. – № 4. – С. 86–93.

8. Бобровский, М.К. О старинной Славянской рукописи хроники Далматской / М.К. Бобровский // Вестн. Европы. – 1824. – № 24. – Т. 139. – С. 258–274.

9. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В.В. Швед. – Гродна : ГрГУ, 2001. – 415 с.

10. Нечухрин, А.Н. Историки Западной Беларуси XIX – начала XX вв. / А.Н. Нечухрин // Наш радавод : матэрыялы міжнар. навук. канф. «Царква і культура народаў Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі XIII – пачатку XX стст.» (Гродна, 28 верас. – 1 кастр.). – Гродно, 1993. – Кн. 5, ч. II. – С. 394–442.

11. Białokozowicz, B. Między Wschodem a Zachodem. Z dziejów formowania białoruskiej świadomosci narodowej / B. Białokozowicz. – Białystok, 1998. – 180 s.

12. Северьянов, С. Супрасльская рукопись : в 2 т. / С. Северьянов. – СПб. : Тип. Императ. акад. наук, 1904. – Т. 1. – VIII, 570 с.

13. Чамярыцкі, В. Супрасльскі рукапіс / В. Чамярыцкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 466.

14. Чамярыцкі, В. Супрасльскі летапіс / В. Чамярыцкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 466.

15. Церашковіч, П.У. Да пытання аб этнічнай ідэнтычнасці М. Баброўскага і І. Даніловіча // Працы гістарычнага факультэта БДУ. – Мінск, 2007. – Вып. 2. – С. 172–178.

16. Латышонак, А. Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі / А. Латышонак // Спадчына. – 1992. – № 1. – С. 9–14.

17. Бобровский, П.О. Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I. Историческое исследование по архивным документам / П.О. Бобровский. – СПб : Тип. В.С. Балашева, 1890. – XVI. – 394 с.

***Pustakhod T.* The Pages of Michael Bobrovsky's Creative Biography. The Beginninig of the Belarusian National Revival**

The article is dedicated to the creative heritage and way of life of a well-known Belarusian scientist, priest, theologian, slavist, orientalist, historian, paleographer, bibliophile, and founder of Skorina studies and Belarus studies of the end of the 18th – the first part of 19th century Michael Bobrovsky, whose biography has not yet seriously attracted the attention of the researchers. The role of his contribution to revelation, studying and collection of Old Church Slavonic ancient manuscripts is described. The main factors, which have influenced the formation of scientist's historic outlook, are mentioned. Michael Bobrovsky's contribution to the formation of the Belarusian national revival and awakening of interest in history and culture of the Belarusian nation has been revealed in this research.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 08.06.2012